www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 6 кастрычніка 2005 года, № 17 (1925)

## БДУ-NEWS

### НОВЫЯ ПРЫЗНАЧЭННІ

Дэканам хімічнага факультэта стаў доктар хімічных навук Уладзімір Васільевіч **ПАНЬКОЎ**.

* * *

Выканаўцам абавязкаў дэкана факультэта філасофіі і сацыяльных навук прызначаны кандыдат філасофскіх навук, дацэнт **Мікалай Аляксандравіч КАНДРЫЧЫН**.

### НАЙЛЕПШЫ МАЛАДЗЁЖНЫ ПРАЕКТ

***Да 19 кастрычніка прымаюцца праекты на конкурс "Найлепшы маладзёжны праект" сярод студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ. Экспертная камісія, узначаленая прарэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Суворавым, падвядзе вынікі конкурсу да 30 кастрычніка.***

Конкурс праводзіцца штогод з мэтай павышэння якасці адукацыі і самарэалізацыі моладзі, раскрыцця творчага патэнцыялу, падтрымкі і стымулявання маладзёжных ініцыятываў. Ва ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю трэба падаць апісанне праекта (у 3 асобніках) і спіс публікацый па тэматыцы праекта і заяўку. Згодна з Палажэннем аб парадку вылучэння грантаў на конкурс, заяўка на ўдзел у конкурсе павінна змяшчаць:

прозвішча, імя, імя па бацьку саіскальніка (калектыву саіскальнікаў) гранта і прозвішча, імя, імя па бацьку;

месца вучобы (працы) саіскальніка (калектыву саіскальнікаў) гранта і кіраўніка калектыву;

інфармацыю пра наяўнасць у саіскальніка (калектыву саіскальнікаў) грамат, дыпломаў, мэтавых прэмій, іншых грантаў і інш.;

інфармацыю пра грамадскую работу, якую выконвае саіскальнік (калектыў саіскальнікаў);

звесткі пра куратара праекта.

**Па больш падрабязную інфармацыю пра ўмовы ўдзелу ў конкурсе звяртайцеся ва ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю ў пакой 207 галоўнага корпуса БДУ, тэл. 209-50-59.**

**ВЕДАЙ НАШЫХ!**

# СТУДЭНТКА БДУ — МІС ІНТЭРНЭТУ

***Пераможцай конкурсу "Міс Інтэрнэт Беларусь — 2005" стала студэнтка трэцяга курса філалагічнага факультэта БДУ Алёна НАРУШЭВІЧ.***



Конкурс праходзіў у 3 этапы. У першым — з лютага па жнівень — маглі прыняць удзел дзяўчаты ад 15 да 30 гадоў, якія пражываюць у Беларусі. Па выніках рэйтынгавага галасавання на сайце www.belarustoday.info былі выбраныя 20 канкурсантак. На другім этапе (з 15 жніўня па 1 верасня) наведвальнікі рэсурсу вызначалі дзесятку лепшых, якія і сталі ўдзельніцамі фіналу. Трэці, заключны этап праходзіў 16 верасня ў начным клубе "Сфера", дзе найлепшую з найлепшых ужо выбірала журы. Акрамя прыгажосці, канкурсанткам неабходна было валодаць і творчымі здольнасцямі, бо фінал уключаў у сябе "хатняе заданне". Меркаванне журы, у склад якога ўвайшлі акцёр і рэжысёр Ігар Забара, кампазітар Макс Алейнікаў, дырэктар салона прыгажосці "Дакрананне" Ларыса Івашкевіч і прадстаўнікі Інтэрнэткрамы "Кветкі кахання", супала з on-line галасаваннем. Пераможцай стала Алёна Нарушэвіч, якая лідзіравала і ў рэйтынгу.

**— Алёна, адкуль з'явілася жаданне ўдзельнічаць у конкурсе?**

— Усё жыццё, пачынаючы з дзіцячага садка, я ўдзельнічала ва ўсіх святах. Сярод маіх дасягненняў — "Міс Снягурка-2004" і "Віцэ-міс Вясна-2004". У мінулым годзе я выпадкова трапіла на конкурс "Міс Інтэрнэт Беларусь", і мяне вельмі ўразіла гэтае шоу, яго маштабы. Я задалася пытаннем: "Ці атрымалася б у мяне перамагчы?" Адзіным спосабам гэта праверыць быў удзел у "Міс Інтэрнэт Беларусь — 2005".

**— Як змянілася тваё жыццё пасля перамогі?**

— Цяпер даводзіцца даваць шмат інтэрв'ю. Дый колькасць паклоннікаў значна павялічылася. А яшчэ... у мяне змянілася светаадчуванне. З'явілася большая ўпэўненасць у сабе. Я зразумела, што калі да нечага імкнуцца, то сапраўды можна гэтага дасягнуць.

**Настасся ЮДЧЫЦ**
**Фота аўтара**

## Вікторыя Гвоздзь:
# "Цікавая краіна — Японія"



***Студэнтка трэцяга курса факультэта міжнародных адносін БДУ Вікторыя ГВОЗДЗЬ заняла першае месца ў конкурсе на лепшае веданне японскай мовы. Другое і трэцяе месца занялі студэнты таго ж самага факультэта Уладзімір УЛАДЗІМІРАЎ і Сяргей ПЯТЭКА.***

Конкурс прысвячаўся 60-годдзю атамнай бамбардзіроўкі Хірасімы і Нагасакі і 20-годдзю Чарнобыльскай катастрофы. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі пасольства Японіі ў Беларусі, Японскі фонд культуры, таварыства "Беларусь—Японія" і Беларуская асацыяцыя выкладчыкаў японскай мовы. Вікторыя Гвоздзь будзе прадстаўляць нашу краіну на міжнародным конкурсе на лепшае веданне японскай мовы, які пройдзе ў Маскве 12 лістапада.

**— Віка, чаму ты захапілася японскай мовай?**

— Спачатку не было ніякага захаплення. Я проста паступіла на спецыяльнасць "лінгвакраіназнаўства" і з усіх прапанаваных мне моў выбрала менавіта японскую. І не шкадую, таму што вывучэнне мовы дае магчымасць пазнаёміцца з культурай і побытам краіны. Японія, на мой погляд, адна з самых цікавых і загадкавых краін.

**— Кім марыш працаваць пасля заканчэння універсітэта?**

— Я хацела б проста выкладаць японскую мову ва універсітэце. Мне здаецца, гэта вельмі высакародна. Хачу быць годным, прыстойным чалавекам.

**— Якую мэту ты ставіла перад сабою, калі ішла на конкурс?**

— На конкурс я ішла не дзеля матэрыяльнай выгоды. За перамогу я атрымала CD-плеер і вельмі радуюся такому падарунку. Але перш за ўсё ўдзел у конкурсе стаў для мяне яшчэ адным жыццёвым выпрабаваннем, спробай усталявацца ў жыцці.

**— Якія пачуцці перад міжнародным конкурсам?**

— Пачуццяў шмат, але пераважаюць хваляванне і адначасова гонар за тую адказнасць, што легла на мяне — прадстаўляць сваю краіну на міжнародным конкурсе. Але цяпер стараюся менш часу прысвячаць эмоцыям, а больш рыхтавацца. А працы шмат.

**Вольга ДУБІНА**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

## БДУ-NEWS

### ДЗЕНЬ ФАКУЛЬТЭТА

Дзень гуманітарнага факультэта, прысвечаны яго заснаванню, адзначылі студэнты і выкладчыкі **4 кастрычніка**. Самае маладое навучальнае падраздзяленне БДУ правяло святочныя мерапрыемствы як на самім факультэце, так і ў актавай зале ліцэя БДУ. Завяршылася свята канцэртам і святочнай дыскатэкай.

### СТУДЭНЦКАЯ СЯМ'Я — XXI СТАГОДДЗЕ

Урачыстае пасяджэнне клуба **"Студэнцкая сям'я — XXI стагоддзе" адбудзецца 6 кастрычніка** ў 212-й аўдыторыі корпуса геафака — напярэдадні тыдня святочных мерапрыемстваў, прысвечаных Дню маці. Пачатак пасяджэння ў 19.15.

### ВЫСТАВА ДА ДНЯ МАЦІ

Выстава твораў мастака Аляксея Кузьміча пачне працаваць **14 кастрычніка** ў будынку рэктарата. Экспазіцыя прысвячаецца Дню маці.

### БЕРАЖЫ ЗДАРОЎЕ ЗМОЛАДУ

БРСМ БДУ сумесна са "Студэнцкім саюзам" нашага універсітэта аб'яўляюць **конкурс творчых работ пра шкоду курэння**: прымаюцца плакаты, вершы, проза, фота-, відэа- і аўдыёсюжэты, шаржы. **Работы прымаюцца ў галоўным корпусе БДУ (пакой 205) да 25 кастрычніка**. Сярод удзельнікаў разыгрываюцца каштоўныя прызы.

Курэнне застаецца адным са значных фактараў павышэння смяротнасці людзей. У Беларусі 85 % захворванняў на рак лёгкіх і 40 % выпадкаў ішэмічнай хваробы сэрца звязаныя менавіта з курэннем. Праблема хвалюе не толькі нашу краіну. Інвестыцыі Еўропы ў здаровую будучыню сваіх грамадзян склалі 72 млн еўра: столькі Еўракамісія асігнавала на антытытунёвую праграму "Дапамога дзеля жыцця без тытуню", якая стартавала ў Брусэлі 1 сакавіка 2005 г. і працягнецца да 2008 г.

### ВЕРШЫ ДЛЯ БДУ

Камітэт БРСМ БДУ абвяшчае **творчы конкурс, прысвечаны святкаванню 84-годдзя alma-mater**. Лірыкаў, фізікаў і ўсіх астатніх чакаюць **да 26 кастрычніка** ў пакоі 205 галоўнага корпуса. Прымаюцца літаратурныя творы любога жанру.

**Падрыхтавала Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

## ЛІСТ У БДУ

# ПАДЗЯКА ЗА ПРАЦУ

*У рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта прыйшоў ліст ад кіраўніцтва будаўнічага ўпраўлення № 66 ЗАТ "Будтрэст № 7". Будаўнікі выказалі падзяку за добрасумленную працу студатрада нашага універсітэта ўлетку на будаўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі.*

**Рэктару Беларускага дзяржаўнага універсітэта, прафесару Стражаву В.І.**

Паважаны Васіль Іванавіч!

Будоўля новага будынку Нацыянальнай бібліятэкі з'яўляецца самым маштабным для Беларусі праектам апошніх дзесяцігоддзяў. У рамках Нацыянальнай бібліятэкі будуць існаваць інфармацыйны і сацыякультурны цэнтры, якія складаюцца з аўтаматызаванай бібліятэчнай сістэмы, сістэмы каталогаў, доступу, захавання, канферэнц-залы, музейнага комплексу, аздараўленчага комплексу і шмат іншага. Увесь комплекс жыццёва неабходны для тэарэтычнай падрыхтоўкі школьнікаў, абітурыентаў, студэнтаў, аспірантаў. У ліпені—жніўні 2005 г. будаўнікамі праведзены асноўны комплекс апрацоўчых работ. У гэты напружаны час разам з нашымі будаўнікамі працавалі ўдзельнікі студэнцкага будаўнічага атрада ГА "Студэнцкі саюз" Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

За час сваёй працы з 05.07.05 г. па 05.08.05 г. удзельнікі будаўнічага атрада працавалі на дапаможных і пагрузачна-разгрузачных работах. Удзельнікі будаўнічага атрада БДУ вылучыліся падтрыманнем працоўнай дысцыпліны, працавалі, не дапускаючы псавання і бою дарагіх імпартных матэрыялаў пры разгрузачных работах, выпадкаў парушэння правілаў тэхнікі бяспекі; своечасова рабілі падноску матэрыялаў на працоўныя месцы па ўсіх паверхах аб'екта.

БУ-66 ЗАТ "Будтрэст № 7", з'яўляючыся генпадрадчыкам па апрацоўчых работах, выказвае ўдзельнікам студэнцкага будаўнічага атрада ГА "Студэнцкі саюз" Беларускага дзяржаўнага універсітэта падзяку за аказаную дапамогу ў выкананні апрацоўчых работ на унікальным архітэктурна-будаўнічым аб'екце "Нацыянальная бібліятэка Беларусі". Жадаем удзельнікам будаўнічага атрада поспехаў у навучанні і запрашаем да далейшага супрацоўніцтва.

**З павагай,**
**дырэктар будаўнічага ўпраўлення № 66**
**ЗАТ "Будтрэст № 7" Б.М. Шэрман**

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Работа ці вучоба? І адно, і другое!

*Сучаснаму студэнту ніяк не абысціся без грошай: трэба і дзяўчыну ў кіно запрасіць, і сабе патрэбную рэч набыць. Зразумела, што адной стыпендыі на ўсё не хопіць. Што ж рабіць у такім выпадку? Адказ адзін — шукаць працу. Можна паклапаціцца пра гэта самому, папрасіць дапамогі ў сяброў, а можна звярнуцца ў Студэнцкі цэнтр занятасці БДУ. Цэнтр прапануе вакансіі на няпоўны працоўны дзень і такія, што не патрабуюць спецыяльнай адукацыі. Напрыклад, толькі мінулым летам акрамя працы ў студэнцкіх атрадах было працаўладкавана 150 студэнтаў БДУ. Было б жаданне, а праца знойдзецца. А вось што расказваюць самі студэнты.*

**Яўген, факультэт радыёфізікі і электронікі, V курс:**

— Ужо трэці год я працую лабарантам на кафедры кібернетыкі. Гэтай працы я прысвяціў амаль увесь вольны час. Але вучоба блізіцца да заканчэння, і неабходна больш стабільнае і прыбытковае месца працы, таму зараз я працую яшчэ праграмістам. Месца на факультэце мне прапанаваў выкладчык пасля пэўных выпрабаванняў, а працу прагарамістам дапамаглі атрымаць у Студэнцкім цэнтры занятасці БДУ. І вось цяпер ужо некаторы час мне даводзіцца сумяшчаць працу і вучобу. Спачатку, канешне, было складана, але прывык і я, і мае выкладчыкі.

**Таццяна, факультэт журналістыкі, II курс:**

— Працую я па спецыяльнасці, журналістам. На журналісцкай "кухні" апынулася я прыкладна з 10-га класа. Лічу, што за гэты перыяд дасягнула пэўных поспехаў у журналістыцы. Праца прыносіць асалоду і дапамагае ў вучобе, таму збіраюся і далей працаваць і дасягаць новых вышыняў у любай прафесіі.

**Віктар, факультэт радыёфізікі і электронікі, V курс:**

— У мяне адразу некалькі месцаў працы. Па-першае, я займаюся сеткавым маркетынгам — з'яўляюся дылерам пейнтбольнага клуба. Па-другое, я працую на эканамічным факультэце БДУ. Там я зарабляю "сімвалічныя" грошы, але ж стаж у працоўную кніжку ідзе. Мяне часта пытаюць, ці не перашкаджае праца вучобе — не перашкаджае. Пацверджаннем гэтаму можа служыць мая залікоўка з выдатнымі адзнакамі. Мне нават хапае часу на тое, каб пачытаць кнігу ці пагуляць у футбол. Галоўнае, правільна размяркоўваць свой час.

**Вольга ДУБІНА**

**Калі вы жадаеце атрымаць дадатковую крыніцу даходаў, звяртайцеся ў Студэнцкі цэнтр занятасці БДУ да Аляксандра Лянкевіча: галоўны корпус, пакой 205, тэл. 209-52-61.**

## ЮБІЛЕІ

# ЗАЎЖДЫ ПАПУЛЯРНАЯ КЛАСІКА

*Сёлета кафедра класічнай філалогіі філфака БДУ адзначае сваё 10-годдзе. 29 верасня адбылося пашыранае пасяджэнне кафедры, прысвечанае яе юбілею. Павіншаваць кафедру прыйшлі яе выпускнікі, студэнты-"класікі", кіраўніцтва факультэта, загадчыкі кафедраў філфака, прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы, упраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы.*

За 10-гадовы перыяд на кафедры шмат чаго мянялася. Пра гісторыю і сённяшні дзень кафедры мы папрасілі распавесці яе загадчыцу, кандыдата філалагічных навук, дацэнта Г.І. Шаўчэнка. Галіна Іванаўна — аўтар больш за 80 навуковых публікацый, у тым ліку 8 навучальных дапаможнікаў і шэрага артыкулаў у вядучых навуковых часопісах Чэхіі, Расіі, Прыбалтыкі. Яна напісала прадмовы да 2 кніг па антычнай культуры, што пабачылі свет у выдавецтве "Беларусь".

**— З чаго пачыналася гісторыя кафедры?**

— Кафедра была адкрытая 1 верасня 1995 г. За год да таго праводзіўся набор на аддзяленне класічных моваў і антычнай літаратуры. За 10 гадоў свайго існавання кафедра класічнай філалогіі падрыхтавала тры выпускі спецыялістаў — разам 40 чалавек. Цяпер у нас працуюць 13 выкладчыкаў, сярэдні ўзрост якіх складае 30 гадоў, сямёра з іх маюць ступені кандыдатаў навук. 31 выпускнік кафедры цяпер працуе выкладчыкамі класічных моваў і антычнай літаратуры ў вышэйшых навучальных установах краіны, што выразна сведчыць пра запатрабаванасць філолагаў-"класікаў" у Беларусі.

**— Чаго дасягнула кафедра за 10 гадоў?**

— Адно з асноўных дасягненняў у тым, што кафедра стала, па сутнасці, агульнауніверсітэцкай. Калі да 1995 г. лацінская мова вывучалася толькі на філалагічным і гістарычным факультэтах, то з 1997 г. гэтая дысцыпліна ўвайшла ў навучальныя планы 8 факультэтаў і юрыдычнага каледжа. Старажытнагрэчаская мова, акрамя класічнага аддзялення, выкладаецца на факультэце філасофіі і сацыяльных навук, а таксама ўвайшла ў магістэрскі курс амаль усіх аддзяленняў філалагічнага факультэта. Змена статусу латыні ва універсітэце запатрабавала не толькі вялікай спецыяльнай падрыхтоўкі выкладчыкаў, але і выклікала неабходнасць стварыць шэраг навучальных і навучальна-метадычных дапаможнікаў, якія адлюстроўвалі б спецыфіку кожнага факультэта.

**— Якія дысцыпліны чытаюць выкладчыкі кафедры?**

— Акрамя агульнаадукацыйных курсаў лацінскай і старажытнагрэчаскай моваў, а таксама курса антычнай літаратуры, на кафедры распрацаваныя і выкладаюцца такія дысцыпліны: уводзіны ў класічную філалогію, гісторыя Старажытнай Грэцыі, гісторыя Рыма, лацінская мова і аўтары, старажытнагрэчаская мова і аўтары, гісторыя старажытнагрэчаскай мовы, гісторыя лацінскай мовы, гісторыя старажытнагрэчаскай літаратуры, гісторыя рымскай літаратуры, антычная міфалогія, методыка выкладання класічных моваў, народная латынь, а таксама 7 спецкурсаў — літаратура эпохі элінізму, медыцынская латынь і інш. На кафедры дзейнічае спецсемінар "Тэорыя і практыка перакладу з класічных моваў на ўсходнеславянскія".

**— А што скажаце наконт навуковай дзейнасці студэнтаў?**

— Мы надаем вялікую ўвагу навуковай рабоце студэнтаў. Студэнты-"класікі" далучаюцца да яе з першага курса: удзельнічаюць у штогадовых факультэцкіх, універсітэцкіх і міжвузаўскіх канферэнцыях.

Пры матэрыяльнай падтрымцы грэчаскага пасольства кафедра атрымала самыя сучасныя тэхнічныя сродкі: камп'ютар, прынтэр, сканер, ксеракс. Падлучанасць камп'ютара да Інтэрнэту дае магчымасць карыстацца фондамі разнастайных бібліятэк свету. Дзякуючы патэнцыялу маладых навуковых кадраў і вялікаму досведу працы дацэнтаў кафедры закладаецца падмурак школы класічнай адукацыі ў Беларусі.

**— На кафедры выдаецца шмат навучальнай літаратуры...**

— Распрацоўка і вывучэнне такой літаратуры сталі прыярытэтамі кафедры. Ужо складзены лацінска-руска-беларускі слоўнік (25.000 лексем), выйшаў у Маскве ў 2002 г. лацінска-рускі слоўнік (каля 2400 словаў) аўтарства маладога выкладчыка Кіра Тананушкі, выдадзена 5 зборнікаў навуковых артыкулаў "Studia philologica", прысвечаных праблемам класічнай філалогіі, грэка-лацінскай тэрміналогіі і рэцэпцыі антычнай культуры ў еўрапейскую. Мы выдалі 9 падручнікаў, а таксама зрабілі больш за 60 дакладаў на канферэнцыях рознага ўзроўню.



**Гутарыла Юлія ПАПОВА**
**Фота аўтара**

# ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

## ГЛЯДЗІ, СЛУХАЙ, ПЫТАЙСЯ

**Псіхалагічная служба БДУ ажыццяўляе дзейнасць па аказанні псіхалагічнай дапамогі і паслуг студэнтам і супрацоўнікам БДУ. Супрацоўнікі службы праводзяць індывідуальныя кансультацыі, псіхалагічныя тэсты, сацыяльна-псіхалагічныя трэнінгі і інш. Акрамя таго, у студэнтаў ёсць магчымасць прыняць удзел у працы студэнцкага псіхалагічнага клуба і клуба ролевых гульняў.**

**Псіхалагічная служба размяшчаецца на адрасе: вул. Кастрычніцкая, 4, пакой 103а, тэл. 206-60-37.**

Вітаем вас, дарагія першакурснікі! Вы пераступілі парог нашага універсітэта, а разам з ім парог новага жыцця, поўнага новых адносінаў, правоў і абавязкаў. Як зрабіць, каб першыя крокі ў гэтым жыцці не былі азмрочаныя непаразуменнем, канфліктамі, крыўдамі?

Найперш пастарайцеся сумленна адказаць сабе на пытанне: чаго я чакаю ад 5 гадоў студэнцтва? Калі ваша мэта — атрымаць дыплом і ўсе магчымыя ўражанні ад студэнцкага жыцця, тады вы, мабыць, засяродзіцеся на грамадскім, культурным, спартыўным жыцці універсітэта, не дамагаючыся бліскучых вынікаў у навучанні. Калі вы хочаце атрымаць максімум для будучай кар'еры, то пачынаць працу трэба ўжо з першага дня. Ва універсітэце вучаць не так, як у школе, выкладчыкі ўвядуць вас у курс прадмета, падкажуць, дзе можна атрымаць веды, а ўзяць іх вы павінны самі.

З першага дня пастарайцеся вывучыць цалкам прозвішча, імя, імя па бацьку свайго дэкана, яго намеснікаў і куратара вашай групы, выкладчыкаў. Узаемаадносіны студэнта і выкладчыка — гэта комплекс узаемных правоў і абавязкаў. Але гэта фармальна, а ў жыцці часам вельмі многае вызначаецца асабістымі адносінамі. І ствараць іх трэба пазітыўна з першага дня, вітаючы выкладчыка і называючы яго па імю і імю па бацьку.

Прыйдзіце ў аўдыторыю як мага раней і займіце месца, на якім будзеце пачувацца найбольш камфортна. Некаму зручней сядзець на першай парце, некаму — «на камчатцы». Важна знайсці сваё месца ў аўдыторыі, на якім вы будзеце адчуваць сябе псіхалагічна абароненым і ўпэўненым. У гэтым выпадку ваша падсвядомасць не будзе адцягвацца на забеспячэнне бяспекі арганізма, і вы зможаце найбольш поўна сканцэнтравацца на лекцыі (ці на тым, чым вы заняты на гэты момант).

З аднакурснікамі найлепш сябраваць. Гэта не парада, а неаспрэчная ісціна. Нават калі ў першы момант вам здасца, што вы патрапілі ў калектыў звар'яцелых геніяў ці, наадварот, людзей не вельмі разумных, то жыццё зменіць гэтае ўражанне. Узаемавыручка акажацца вельмі зручным спосабам здаць іспыты ці падрыхтавацца да семінарскіх заняткаў.

Адносіны — штука складаная. Бывае так, што нягледзячы на ўсе парады, папярэджанні, перасцярогі, сітуацыя выходзіць з-пад кантролю і вы ўжо разумееце, што не здолееце справіцца з ёй самастойна. Не зацягвайце вырашэнне праблемы, прыцягвайце спецыялістаў, якімі могуць выступіць куратары груп, сацыяльныя педагогі і псіхолагі.

Галоўнае правіла навічка ў кожнай справе: «Глядзі, слухай, пытайся». Цікаўнасць не загана, асабліва для першакурсніка. Калі хочаце хутка асвойтацца і стаць сваім сярод шматтысячнай студэнцкай брацці,назірайце за навакольнымі — гэта дапаможа вам зразумець, што рабіць у той ці іншай сітуацыі. І не саромцеся пытацца, удакладняць нешта. Магчыма, першым часам давядзецца трываць уздыхі, воклічы «Вох ужо гэтыя першакурснікі!». Няхай вас гэта не спыняе. Спакойна перапытайце тое, што хацелі даведацца.

Не бойцеся іспытаў: самым суровым экзаменатарам для чалавека становіцца жыццё. А ў жыцці можа спатрэбіцца менавіта тое, што вы калісьці не захацелі ведаць. Таму выснова адна: вучыце і не бойцеся спытацца.

Удачы вам у пакарэнні універсітэцкіх вяршыняў. Няхай усё задуманае здзейсніцца, апраўдаюцца самыя смелыя надзеі!

**Аксана КУТКОВІЧ**

## ТВОРЧЫЯ КАЛЕКТЫВЫ ЗАПРАШАЮЦЬ

*У нашым універсітэце кожны можа знайсці занятак сабе па душы. Для аб'яднання творчых асобаў працуе ўпраўленне па справах культуры. Гонарам упраўлення з'яўляюцца мастацкія калектывы.*

**Народная харавая капэла** вядзе сваю гісторыю з 1946 г. У рэпертуары калектыву — творы рускіх, беларускіх, замежных кампазітараў, а таксама апрацоўкі народных песень. Заняткі адбываюцца па панядзелках, сярэдах, пятніцах у 19.30 у аўдыторыі 433 галоўнага корпуса.

**Народны фальклорны ансамбль «Тутэйшая шляхта»** мае ў сваім рэпертуары арыгінальную беларускую народную музыку XVIII—XX стст. Заняткі адбываюцца па аўторках і чацвяргах з 17.00 да 19.00 у актавай зале філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31).

**Народны аркестр народных інструментаў** — адзін з найстарэйшых калектываў Беларусі: у 2006 г. яму споўніцца 60 гадоў. Аркестр выконвае народныя песні і танцы, творы беларускіх, рускіх і замежных кампазітараў. Заняткі ладзяцца па панядзелках і сярэдах у 19.30 у аўдыторыі 607 галоўнага корпуса БДУ.

**Клуб аўтарскай песні** заснаваны ў 1998 г. У яго ўваходзяць аўтары і выканаўцы бардаўскай песні. Заняткі праводзяцца па аўторках у 18.00 у аўдыторыі 605 хімічнага факультэта.

**Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш»** займаецца збіраннем, вывучэннем і выкананнем беларускіх народных песень, танцаў і музыкі. Заняткі ладзяцца па аўторках і чацвяргах у 18.30 у галоўным корпусе.

**Народны ансамбль танца «Крыжачок»** дае гастролі ў Беларусі і па-за яе межамі ўжо на працягу больш чым 50 гадоў. Калектыў — лаўрэат Сусветнай асацыяцыі універсітэтаў і дыпламант XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве. Заняткі адбываюцца па панядзелках, сярэдах і чацвяргах у 19.30 у спартыўнай зале галоўнага корпуса.

**Народны музычны тэатр-студыя БДУ «На філфаку»** створаны ў 1997 г. У рэпертуары калектыву класіка, калажы, фантазіі на паэтычныя тэмы, дзе багата музыкі, песень, пластыкі. Заняткі ладзяцца па панядзелках, сярэдах, чацвяргах у 19.00 у актавай зале філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31).

**Народны тэатр-студыя «На балконе»** — лаўрэат фестывалю народнай творчасці «Сузор'е» (2001). На Эдынбургскім міжнародным фестывалі «Fringe—2001» тэатр атрымаў 4 зоркі і спецыяльны прыз прэсы. Заняткі адбываюцца па аўторках, чацвяргах і пятніцах у 18.00 на 5-м паверсе галоўнага корпуса БДУ.

**Па больш падрабязную інфармацыю звяртайцеся ва ўпраўленне па справах культуры БДУ: прасп. Незалежнасці, 4, пакой 211, тэл. 209-54-69**



## БІБЛІЯТЭКА БДУ: ЯК, ШТО І КОЛЬКІ

Бібліятэка падчас навучання становіцца неад'емным памочнікам для студэнтаў. Адказы амаль на ўсе пытанні можна знайсці менавіта тут. А каб праца ў бібліятэцы была больш эфектыўнай, варта ведаць, як храм ведаў функцыянуе, якія паслугі прапануе.

Студэнты кожнага факультэта БДУ адносяцца да вызначанага абанемента (іх усяго 9) і маюць права карыстацца толькі яго паслугамі. Затое яны могуць наведваць любую з 17 чытальных залаў, размешчаных амаль на кожным факультэце.

Фундаментальная бібліятэка БДУ аказвае шмат паслуг, як традыцыйных, так і сапраўды наватарскіх. Сярод бясплатных — карыстанне картачнымі і электроннымі каталогамі, картатэкамі, базамі даных, выдача ў часовае карыстанне ў чытальных залах і на абанементах друкаваных выданняў, навучанне студэнтаў пошуку інфармацыі ў базах даных, арганізацыя разнастайных выстаў і прэзентацый.

З 2004 г. у бібліятэцы ўведзены платныя паслугі. Яны накіраваны, з аднаго боку, на спрашчэнне працы студэнта ў бібліятэцы, з другога — на збор сродкаў для далейшага папаўнення фондаў.

**Платныя паслугі:**

выдача на ноч кніг з чытальных залаў (760 руб. за экзэмпляр у дзень), або на 1 гадзіну, напрыклад, для ксераксу (звычайная кніга — 60 руб./экз., з аддзела рэдкіх і каштоўных выданняў – 2000 руб./экз.);

утрыманне кніг звыш тэрмінаў, вызначаных Правіламі карыстання ФБ БДУ (на абанеменце — 60 руб. экз./дзень, у чытальнай зале – 1350 руб. экз./дзень);

тэматычныя падборкі бібліятэкарам па запыце студэнта (80 руб./дакумент, 60 руб./запіс з электроннага каталога і базы даных);

афармленне (290 руб./бібліяграфічны запіс) і рэдагаванне (140 руб./бібліяграфічнае апісанне) бібліяграфічных спісаў да навуковых, дыпломных, курсавых і іншых прац;

сканіраванне дакументаў без распазнавання і з ім (320 руб. за 1 стар. А4 і 370 руб. адпаведна).

Бібліятэка БДУ таксама займаецца продажам спісаных з яе фондаў выданняў — 1300 руб./дакумент або 500 руб. за кнігу, якую не купілі на працягу года. У будынку філалагічнага факультэта (вул. К.Маркса, 31) у кабінеце 124 нязменна на працягу навучальнага года, у будні дні з 11 да 16 гадзін, дзейнічае выстава-продаж мастацкай, філасофскай, філалагічнай літаратуры і кніг па замежных мовах.

**На сайце ФБ БДУ www.library.bsu.by у хуткім часе плануецца адкрыццё рубрыкі "Запытай бібліятэкара", дзе можна будзе пакінуць любое пытанне пра дзейнасць бібліятэкі.**

Настасся ЮДЧЫЦ
Фота аўтара

**Спіс бібліятэк, якія бясплатна абслугоўваюць на абанеменце студэнтаў, што жывуць у інтэрнатах:**

Бібліятэка №2 імя Крупскай (Усходняя, 56;тэл. 2883084)

Бібліятэка №5 (Казлова, 2а; тэл. 2843985)

Бібліятэка №16 (пр.Ракасоўскага, 50; тэл. 2148388)

Бібліятэка імя Міцкевіча (пл.Незалежнасці, 15; тэл. 2005632)

Бібліятэка імя Пушкіна, абласная (Гікалы, 4; тэл. 2390843)

**Спіс бібліятэк, якія абслугоўваюць на абанеменце студэнтаў, што жывуць у інтэрнатах, пад заклад дакументаў ці грошай (грашовы заклад вызначаецца ў залежнасці ад каштоўнасці кнігі):**

Бібліятэка №3 імя Маякоўскага (Сяліцкага, 103; тэл. 2449901) — дакументы

Бібліятэка №9 (Лібкнехта, 51; тэл. 2006277) — дакументы/грошы

Бібліятэка №11(праезд Ташкенцкі, 3; тэл. 2410719) — грошы

Бібліятэка №15 імя Цёткі (Талбухіна, 14а; тэл. 2663898) — грошы

Бібліятэка №17 (Лагойскі тракт, 25; тэл. 2621126) — дакументы

Бібліятэка №18 (Каліноўскага, 55; тэл. 2654927) — дакументы

Бібліятэка №20 (Жукоўскага, 9/1; тэл. 2247561) — грошы

**Каб запісацца ў бібліятэку, вам спатрэбяцца: пашпарт, фотаздымак (для чытацкага білета), каля 2000 рублёў (за чытацкі).**

Падрыхтавала Ала МАЧАЛАВА

## АБ’ЯВЫ

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”, факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў кастрычніку-снежні 2005 г. выкладчыкаў і спецыялістаў БДУ:**

1. Сістэмныя асновы інавацыйнай дзейнасці (для выкладчыкаў ВНУ) — вочная (10.10—15.10, 28.11—03.12);
2. «Чалавек. Грамадства. Дзяржава»: роля дысцыпліны ў фарміраванні светапогляду і ідэалагічным выхаванні (для выкладчыкаў) — вочная (10.10—21.10);
3. Актуальныя праблемы ўдасканальвання фінансавых адносін, арганізацыі ўліку і падаткаабкладання (для работнікаў бухгалтэрый і планава-эканамічных службаў ВНУ) — вочная (10.10—22.10);
4. Псіхалагічнае здароўе выкладчыка і прафесійная надзейнасць (для выкладчыкаў) — вочная (12.10—10.11, 2 разы ў тыдзень);
5. Кіраванне адукацыйнымі ўстановамі ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь (для рэзерву загадчыкаў кафедраў) — вочная (17.10—28.10);
6. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці і патрыятычнага выхавання (для выкладчыкаў беларусазнаўчых дысцыплін і ідэалагічных работнікаў установаў адукацыі) — вочная (24.10—05.11);
7. Этыка і культура педагагічнай дзейнасці (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ) — вочная (31.10—05.11);
8. Праектаванне спецыяльнасцей і кваліфікацыі вышэйшай адукацыі (для кіраўнікоў і спецыялістаў установаў адукацыі) — вочная (08.11—19.11);
9. Педагагічнае майстэрства выкладчыка: сутнасць, змест, сродкі фарміравання (для выкладчыкаў) — вочная (08.11—14.12, 2 разы ў тыдзень);
10. Падрыхтоўка кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі: актуальныя праблемы і кірункі ўдасканалення (для загадчыкаў аддзелаў магістратуры, аспірантуры і дактарантуры) — вочная (08.11—12.11);
11. Ідэалагічная работа ў вышэйшай школе (для намеснікаў дэканаў па выхаваўчай рабоце) — вочная (14.11—25.11);
12. Ідэалагічныя і выхаваўчыя асновы выкладання рускай літаратуры (для выкладчыкаў) — вочная (14.11—26.11);
13. Правы чалавека і дзяржаўная ідэалогія Беларусі: пытанні тэорыі і методыкі выкладання (для выкладчыкаў) — вочная (14.11—26.11);
14. Псіхалагічная гатоўнасць выкладчыкаў да работы з адоранай асобай (для выкладчыка) — вочная (14.11—19.11, 05.12—10.12);
15. Праектаванне і распрацоўка электронных навучальных матэрыялаў (для выкладчыкаў) — вочная (21.11—26.11);
16. Дзяржава і моладзь: метадычнае суправаджэнне ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў ВНУ (для выкладчыкаў і спецыялістаў сістэмы адукацыі) — вочная (28.11—09.12);
17. Тэорыя і методыка навучання гісторыі ва ўмовах мадэрнізацыі адукацыйнай сістэмы (для выкладчыкаў) — вочная (05.12—17.12)

**Калі вас зацікавіла наша інфармацыя і вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па №№ 222-83-03, 200-20-47 для папярэдняга запісу ў групы.**

**Наш адрас: 220001, г.Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб. 319, 320, тэл./факс 200-25-51.**

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ТЭАТРАЛЬНАЯ СКАРБНІЦА

***На працягу 6 дзён на трох пляцоўках Мінска 14 калектываў з Беларусі, Расіі, Літвы, Швейцарыі і Іспаніі паказалі 14 спектакляў, якія наведалі 11.750 паклоннікаў Мельпамены. З такім вялікім размахам прайшоў II Міжнародны фестываль студэнцкай творчасці “Тэатральны куфар”.***



У гэтага мерапрыемства, нягледзячы на “дзіцячы” ўзрост, ужо з’явілася адметнасць, своеасаблівая “фішка” — перформанс-акцыя “Трамвай жаданняў”. 27 верасня ад Зялёнага Луга да будынка ліцэя БДУ прабег упрыгожаны трамвайчык з удзельнікамі фестывалю, якія запрашалі мінчан на “Тэатральны куфар”. У гэты ж дзень фестываль адкрылі пераможцы мінулага года – тэатр-студыя “Цэнтр” (Санкт-Пецярбург) спектаклем “Дні нашага жыцця” па апавяданнях Р. Брэдберы.

“Тэатральны куфар” праходзіў пад дэвізам “Традыцыі. Пошук. Эксперымент”. І сапраўды, спектр прадстаўленых спектакляў быў шырокім — ад сучаснай драматургіі (А. Дудараў, І. Хабарава) да класікі (А. Чэхаў, Р. Брэдберы) і авангарда (калектывы з Італіі і Швейцарыі).






У рамках тэатральнага форуму рэжысёр, выкладчык, мованазнаўца і перакладчык з Швецыі Ліф Олсан правёў два майстар-класы. Ён выкарыстоўвае імправізацыю як галоўны метад для разнявалення чалавека, яго душы, голасу.

Сёлета ўпершыню на фестывалі з’явілася прафесійнае міжнароднае незалежнае журы. У яго склад увайшлі дзеячы культуры і мастацтва з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Швецыі і Бельгіі. Яны ўручылі тры маленькія куфры — М. Клімавай “За лепшую жаночую ролю” (Зіна з спектакля “Не пакідай мяне...” тэатра “Пілігрым”, Полацк), Д. Аўмочкіну “За лепшую мужчынскую ролю” (інтэлігент з “Я хачу жыць!” Наваполацкага тэатра “Арт”) і “Хору” — “За лепшы спектакль” (тэатр “На філфаку”). На цырымоніі закрыцця, якая адбылася 2 кастрычніка, журы расшчодрылася і нечакана для ўсіх аб’явіла аб уручэнні спецыяльных прызоў. У намінацыі “Тэатр-эксперымент” перамагла трупа NKSA з Швейцарыі, якая здзівіла гледачоў сваёй незвычайнай пастаноўкай “Беласнежка едзе ў Мінск”, тытул “Самы арыгінальны спектакль” атрымала пастаноўка “Сукіны дзеці” Літоўскага тэатра “Palepe”.

Як і ў мінулым годзе, гледачы таксама ацэньвалі спектаклі. Па выніках іх галасавання “Прыз глядацкіх сімпатый” — галоўны куфар — атрымаў спектакль “Не пакідай мяне...” па п’есе А. Дударава.

**Настасся ЮДЧЫЦ**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

**Больш падрабязную інфармацыю пра фестываль “Тэатральны куфар” можна атрымаць на сайце: www.theatre-fest.bsu.by**

## УСПАМІН ПРА ЛЕТА

# СКАНДЫНАЎСКІЯ ВАКАЦЫІ

***Гэтым летам каля 100 студэнтаў з розных ВНУ Беларусі атрымалі магчымасць прыняць удзел у шырокамаштабным шведскім праекце VISBY Programme.***

На працягу ліпеня і жніўня ў розных рэгіёнах Швецыі праходзілі 7 двухтыднёвых летніх школ, прысвечаных развіццю еўрапейскай супольнасці, абароне правоў чалавека, функцыянаванню сістэмы адукацыі, масмедыя, сацыяльнай і палітычнай сфер у Швецыі, а таксама іншых еўрапейскіх дзяржавах. Сёлета праграма VISBY была арыентавана на тры суседнія краіны — Расію, Украіну і Беларусь, студэнты якіх і сталі яе непасрэднымі ўдзельнікамі.

Тыя, хто зацікавіўся праграмай, могуць звярнуцца на сайт www.studyinsweden.se, дзе можна пазнаёміцца з новымі праектамі Шведскага інстытута ў галіне адукацыі і міжнароднага навуковага супрацоўніцтва.

**Ірына ПАРХОМЕНКА,**
**студэнтка аддзялення сацыялогіі ФФСН БДУ**

**АД РЭДАКЦЫІ. Поўны тэкст артыкула Ірыны можна прачытаць на сайце газеты “Універсітэт” (www.gazeta.bsu.by).**

## АБ’ЯВЫ

**РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі, тэхналогій камунікацыі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: лазернай фізікі і спектраскапіі, крымінальнага права, рускай мовы, гісторыі беларускай літаратуры;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: радыёфізікі, інфарматыкі, фізікі, дыферэнцыяльных ураўненняў, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, тэарэтычнай і прыкладной механікі, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, менеджменту, банкаўскай і фінансавай эканомікі, агульнага землязнаўства, матэматычный фізікі, канстытуцыйнага права, грамадзянскага права, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, паліталогіі, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, крыміналістыкі, гісторыі беларускай мовы, гісторыі беларускай літаратуры, атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі, біяфізікі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай матэматыкі і інфарматыкі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, крыніцазнаўства, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, нямецкай мовы, інтэлектуальных сістэм, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, англійскага мовазнаўства, класічнай філалогіі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнага землязнаўства, менеджменту, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, раманскага мовазнаўства, гісторыі беларускай мовы, англійскага мовазнаўства, нямецкага мовазнаўства;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычнага забеспячэння АСУ, біяфізікі.

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб’явы.**

**Адрас: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

6 кастрычніка 2005 года
Падпісана да друку 05.10.2005 г.
Зак. 835. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП “Выдавецкі цэнтр БДУ”.
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by